раскрыць унутраны свет аўтара, яго псіхалогію, звязаць асаблівасці яго светаўспрымання не толькі з агульнапрынятымі ўяўленнямі, але і з народнымі традыцыямі. Якуб Колас дасягнуў настолькі вялікага майстэрства ў колерапісе, што гэта стала пачаткам новай традыцыі ў нацыянальнай літаратуры, якую падтрымалі і працягнулі далей І. Мележ, І. Шамякін, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў, М. Стральцоў, І. Навуменка і іншыя майстры беларускага прыгожага пісьменства ХХ стагоддзя.


### ЛІТАРАТУРА

1. **Андраюк, С. А.** Да пытання аб індывідуальным стылі пісьменніка / С. А. Андраюк // Стыль пісьменніка / пад рэд. В. В. Барысенкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 448 с. – С. 3–18.
2. **Бельскі, А. І.** Пейзаж у беларускай паэзіі (эвалюцыя паэтыка, сістэма вобразаў): дыс. ...д-ра філал. навук: 10.01.01 / А. І. Бельскі; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 1997. – 250 с.
3. **Борев, Ю. Б.** Природа стиля и стилистический анализ / Ю. Б. Борев // Марксистско-ленинская эстетика и художественное творчество: сб. ст. / сост. И. С. Куликова, А. Я. Зись. – М.: Прогресс, 1980. – 405 с. – С. 337–347.
4. **Жураўлёў, В. П.** Магчымасці рэалізму: прычыннасць і гістарызм / В. П. Жураўлёў, М. А. Тычына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 232 с.
5. **Кандинский, В.** О духовном в искусстве / В. Кандинский // Труды Всероссийского съезда художников в Петрограде: в 2 т. Т. 1. – Пг., 1914. – 263 с. – С. 44.
6. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972 – 1978. – Т. 4: Апавяданні 1906 – 1917. – 1973. – 344 с.
7. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972 – 1978. – Т. 5: Апавяданні паслякастрычніцкага перыяду. «Казкі жыцця». – 1973. – 632 с.
8. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972 – 1978. – Т. 9: На ростанях: трылогія. – 1975. – 792 с.
9. **Навуменка, І. Я.** З глыбінь народных: крытычныя эцюды аб творчасці Якуба Коласа / І. Я. Навуменка. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1960. – 110 с.
10. **Шамякіна, Т.** На лініі перасячэння: літ.-крытыч. нататкі / Т. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 143 с.



*У артыкуле разглядаецца трансфармацыя прафаннага (абыдзённага) часу ў сакральны (парогавы, святочны, абрадавы). На падставе абрадавай практыкі беларусаў паказваецца, што і сакральны час у нашай этнічнай культуры штогод патрабуе абавязковай «падзаводкі» шляхам актуалізацыі адпаведных абрадаў.*


# АСАБЛІВАСЦІ АБРАДАВАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ ПРАФАННАГА ЧАСУ Ў САКРАЛЬНЫ

## Традыцыйная практыка беларусаў




**А. В. Катовіч,**
старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ


Багатая вуснапаэтычная спадчына беларускага народа, яго абрадавая практыка і гаспадарчая дзейнасць пераканаўча сведчаць аб тым, што ў кожнай з гэтых складовых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вялікая ўвага надавалася асэнсаванню і парадкаванню часу ў цэлым і вызначэнню ролі і месца асобных адзінак у прыватнасці. Кожная з адзінак часу (год, месяц, тыдзень, суткі або дзень), якімі шырока карысталіся нашы продкі ў паўсядзённай і святочна-абрадавай дзейнасці, пастаянна ўваходзіла ў складаныя ўзаемасувязі ў межах самой сістэмы часазлічэння. Прычым значная колькасць кантэкстаў (як абрадавых, так і пазаабрадавых) сведчыць пра тое, што чым меншая адзінка часу, тым у больш складаны характар узаемасувязей яна ўключаецца.

## ✍ Сакральнае-прафаннае

Сімвалам структурнай цэласнасці і сістэмнай упарадкаванасці з'яўляецца касмічны цыкл і, адпаведна, каляндарны год. «Год уяўляе сабой, – сцвярджае С.Д. Домнікаў, – ідэальную мадэль завершанага часавага цыкла – жыццё свету ў яго згорнутым варыянце, якое задае рытм чалавечаму жыццю» [3, с. 107]. Зусім не выпадкова **сімвалам касмічнага цыкла стала кола**, а каляндарны цыкл святочных падзей атрымаў назву гадавога кола або колазвароту. Пры гэтым неабходна заўважыць, што ў пераважнай большасці каляндарных абрадаў абавязковымі кампанентамі сталі: а) абход вёскі ў накірунку руху Сонца як сімвал распачынання гадавога колазвароту (калядоўшчыкамі, валачобнікамі, гуртам жанчын на Юр'е або падчас выканання аказіянальных абрадаў, звязаных з працяглай засухай ці бясконцымі дажджамі); б) летняе або восеньскае абворванне (замыканне, адмежванне ад беды ці ліхой навалы) населенага пункта; в) ваджэнне карагодаў, большасць з якіх нагадвала абрысы сузор'яў, якія ўтваралі задыякальнае кола, а частка з іх мела форму замкнёнага кола. Поўны цыкл каляндарнага часу фіксаваў заканчэнне года і вяртанне свету «на кругі свае».

Міфалогія славянскіх народаў, спазнаўшая ўплыў хрысціянскай дагматыкі, распавядае, што ў стварэнні свету прымалі ўдзел дзве сілы: Бог і Чорт. Гэта зыходнае процістаянне і стала першаасновай падзелу ўсяго існага на зямлі на станоўчае і адмоўнае. У адпаведнасці з даследаваннямі К. Леві-Строса, свядомасць старажытнага чалавека дзяліла ўсю прастору і час на бінарныя апазіцыі, супрацьлегласці, скіраваныя да розных полюсаў, у тым ліку і ў плане асэнсавання каштоўнасных падыходаў. Пазней гэта процістаянне было перанесена літаральна на ўсе бакі жыцця грамадства. Міфапаэтычная мадэль свету ў традыцыйных культурах розных этнасаў ахоплівае, па падліках розных навукоўцаў, да 25 бінарных апазіцый [5, с. 440], сярод якіх структураўтваральнымі з'яўляюцца: правае – левае, спераду – ззаду, верх – ніз, мужчынскае – жаночае і г. д. У гэту сістэму процістаянняў дакладна ўкладваецца і прасторава-часавы кантынуум, у якім прыярытэтнымі з'яўляюцца апазіцыі **маё – чужое**, якія М. Эліадэ падзяліў па прынцыпе **сакральнае – прафаннае** [11, с. 48–74].

Як толькі чалавек трапляў у межы прасторы сакральнага комплексу, ён запускаў механізм вітальнай магіі, што вымагала адпаведных паводзін. Так, у месцах правядзення розных абрадаў удзельнікі акрэслівалі прастору і пасярэдзіне клалі (чарцілі) крыж. Чалавек, які падыходзіў да сакральнага локуса, дакладней, аказваўся на мяжы яго прасторы, павінен быў перш-наперш перахрысціцца. З гэтай хвіліны паводзіны яго станавіліся рэгламентаванымі, прадвызначанымі традыцыяй і нормамі звычаёвага права. Калі локус сакральнага комплексу – дом, то, зразумела, што ён пастаянна быў актуалізаваны ў надзвычайным статусе. Узгадаем: гаспадары кожнай хаты штогод свята за святам абнаўлялі абрадавыя атрыбуты, якія выконвалі ролю абярэгаў і самой прасторы пражывання, і адначасова ўсіх дамачадцаў. Пры гэтым часцей за ўсё здаралася так, што кожны чарговы абрадавы атрыбут захоўваўся ў хаце на працягу каляндарнага года, а затым знішчаўся, саступаючы месца новаму (аднаўленаму, як гэта адбываецца з велікодным яйкам, або абноўленаму: агарак мінулагодняй свечкі-грамніцы ўплаўлялі, укатвалі ў воск для прыгатавання новай).

У шэрагу мясцін раз (а дзе і некалькі разоў) на год святыя крыніцы становяцца месцам правядзення хрэсных хадоў, якія скіраваны на аднаўленне (падмацаванне) надзвычайнага абрадавага статуса. Перад тым як увайсці ў прастору сакральнага локуса, удзельнікі паломніцтва спраўляюць непрацяглае набажэнства: яго можна тлумачыць як атрыманне дазволу патрапіць у замкнёную прастору. Пасля гэтага адбываецца яшчэ адзін малебен – адрасаваны вадзе, і толькі нагавораная, намоленая вада становіцца галоўным атрыбутам завяршальнага этапа абраду і, уласна кажучы, мэтай правядзення самога шэсця.

У такім разе напрошваецца зусім не рытарычнае пытанне: святая крыніца пастаянна ўтрымлівае статус святасці або гэта «святасць» праз нейкі час патрабуе пэўнай «падзаводкі» – г. зн. перабудовы свету на новы год?

Наш уласны ўдзел у некалькіх хрэсных хадах дазволіў зразумець адну вельмі важную акалічнасць у правядзенні гэтых каляндарных абрадаў. Аказалася, што хрэсны ход да адной з такіх сакральных мясцін утрымліваў у сабе два разнанакіраваныя вектары касмагоніі. З





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аднаго боку, шэсце да крыніцы павінна было аднавіць статус сакральнасці свяшчэннага локуса на новы гадавы цыкл, з другога – запусціць механізм дзеяння адноўленага часу для яго ўдзельнікаў. Адна з жанчын – удзельніц хрэснага хода да «прошчы» (крыніцы) у в. Любонічы Кіраўскага раёна напрыканцы малебна, калі прыгубіла кубачак з крынічнай вадой, сказала: «Ну, калі дайшла да крыніцы, то і гэты год пераажыву».

## ✍ Прынцып палярнасці

Калі прыняць за аснову філасофскі тэзіс аб непадзельнасці прасторава-часавага кантынуума, то, у адпаведнасці з законамі фармальнай логікі, час павінен быць сінхранізаваны з сакральным статусам прасторы. Аднак на самай справе гэта не зусім так. **Суцэльным патокам цячэ прафанны час. Ён усеабдымны**. А ўжо ў яго гамагеннай плыні з'яўляюцца дыскрэтнасці, якія надаюць яму статус сакральнасці. Так, калі на Русальным тыдні дзяўчаты разам са старэйшай жанчынай вясковага соцыуму ішлі ў бярозавы гай ладзіць абрад Кумлення, то яны акрэслівалі прастору адпаведнымі маркёрамі, за якія хлопцы не мелі права заходзіць [4, с. 161–162]: *«Кто в чарте, тот Богов, за чартой, тот чёртов... /У чарте хахочуть, за чартой рягочуть.../»* [6, с. 325]. Калядоўшчыкі выконвалі святочны абход вёскі, усе людзі ведалі аб гэтым, з нецярплівасцю чакалі іх. І тым не менш, каля кожнай хаты выконваўся спецыяльны рытуал атрымання дазволу зайсці ў хату. На Восеньскія Дзяды душы памерлых продкаў запрашаліся на святочную вячэру толькі на пэўны тэрмін, але затым іх праводзілі адпаведным слоўным зваротам: «...*а лепей: ляціце на неба!*» [1, с. 178].

Уласна кажучы, паралелей з прасторай можна праводзіць шмат. Калі мы прымаем за аксіёму, што локус знаходжання сакральнага аб'екта заўсёды сакральны, але для яго надзвычайнай актуалізацыі павінен быць чалавек, які сваімі спецыфічнымі дзеяннямі будзе маніфеставаць яго статуснасць, то гэты ж самы прынцып можа быць перанесены і на ўспрыманне часу. Калі агульнае рэчышча часу гамагеннае і прафаннае, будзённае, то дастаткова, напрыклад, парадзісе адчуць набліжэнне родаў, як тут жа будзе ўключаны механізм сакралізацыі часу, прычым незалежна ад часу сутак.

З іншага боку, у аснове тапагоніі – часу першатварэння аб'ектаў акаляючага асяроддзя – ляжаў прынцып палярнасці: святая мясціна – гіблае месца. Напрыклад, у Чэрвеньскім раёне побач знаходзяцца дзве мясціны з розным характарам семантызацыі: Віленчыкава гара (там, дзе знаходзілася панская сядзіба і некалькі захаванняў з надмагільнымі камянямі) – Ласіная смерць (месца, дзе паміж двух дрэў ушчаміўся і загінуў лось).

Палярызацыя семантыкі і сімволікі прасторавых локусаў непазбежна ўплывала на характар асэнсавання і структурыраванне часу. М. Эліадэ супрацьпастаўляе свяшчэнны і прафанны час як святочны і будзённы. Пры гэтым ён адзначае, што плынь прафаннага часу быццам бы разрываецца і ў яе жывую аднародную тканку ўводзіцца імплантант, які надасць часу статус сакральнага. Абрадавае дзеянне, якое нагадвае-капіруе акт колішняга першатварэння багоў і шматразова адноўленае дзеяннямі тых, хто стаяў каля вытокаў таго ці іншага роду, утрымлівае ў сабе інтэнцыю самазахавання, абнаўлення, аднаўлення і перанараджэння і трансфармуе час у сакральны. Разам з тым шматлікія фальклорныя творы і сучасны наратыўны дыскурс, здзейснены ў час палявых даследаванняў, сведчаць аб тым, што плынь самога прафаннага часу зусім не аднародная. На гэту неаднароднасць могуць уплываць перш за ўсё астракасмічныя фактары: усход Сонца, поўнач, фактар «трэціх пеўняў», шырока і шматбакова разглядаемы ў чарадзейных казках (якраз тры гадзіны ночы з'яўляюцца той часавай мяжой, пасля якой нячыстая сіла страчвае сваю злаўмысную моц), чаргаванне фаз Месяца. Ёсць яшчэ адзін фактар структурыравання часу, які выразна фіксуецца ў народнай свядомасці, але пры гэтым захоўвае выключную няўлоўнасць. Гэта ўяўленне аб тым, што існуе супрацьпастаўленне **добрая – кепская хвіліна, добрыя – злыя дні**: «Шчасце чалавека залежыць ад хвіліны, у якую ён нарадзіўся. Калі ў шчаслівую хвіліну, то будзе яму шанцаваць, калі ў нешчаслівую – будзе нешчаслівы. Вызначаюць гэта найчасцей словамі: «Ён на такой часіне радзіўся» [7, с. 94–95].

У дачыненні да сістэмы асэнсавання і парадкавання часу прынцып структурнага процістаяння добрага і кепскага часу [7, с. 94–95 ] меў у свядомасці вясковага жыхара надзвычайны статус. Найбольш пераканаўча аб гэтым сведчаць шматлікія падарожныя замовы. Той, хто збіраўся ў дарогу, «абгароджваў» і адначасова «адгароджваў» сябе ад усяго навакolля: *«Іду я ў дарогу, Гасподзь Бог са мною. Мацер Божая перад глазамі, Ісус Хрыстос за плячамі, з бакоў ангелы мяне ахраняюць – усю бяду ад мяне адганяюць»*. Тыя, хто праводзіў чалавека, прамаўлялі пажаданне або зычэнне: *«Дай, Божа, у добры час*!»

У кантэксце вясельнага абраду традыцыйнае, у пэўнай ступені рытуалізаванае зычэнне ператваралася ў сакралізаванае агульнасямейнае благаслаўленне: *«Дай, Божа, у добры час пачаць, /У злы – памаўчаць! /Родныя бацька і маці! /Станьце на пастаці, /Дайце*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*благаславенне свайму дзіцяці!»* [2, с. 291]. Гэты ж самы матыў або алгарытм актуалізаваўся ў кантэксце вяселля неаднаразова, напрыклад, калі распачыналі прыгатаванне або дзяльбу каравая: *«Зачынай у Божы час, як у людзей, так і ў нас!»* [2, с. 133].

Прасторава-часавы кантынуум міфапаэтычнай спадчыны беларусаў цалкам стасуецца з агульнаславянскай мадэллю свету, якая грунтуецца на шэрагу бінарных апазіцый. Палюсарныя процістаянні ахопліваюць як прасторавыя каардынаты («святое месца» і «гіблае месца»), так і часавыя характарыстыкі. Узгадайце, якія папярэджанні або рэгламентацыі прыхаваны за такімі прыкметамі: «зачапіцца нагой за парог» (у гэтым выпадку нас цікавіць адначасова і парогавая зона сама па сабе, і фактар сакральнага часу) або «чорная кошка перабегла дарогу». Філасофская квінтэсенцыя «тут і зараз» факусіруе ў сабе каардынаты прасторы і часу і тым самым прымушае ўключаць шырокае поле этнакультурных кантэкстаў у працэс аналізу асобных міфапаэтычных канцэптаў. Мы маем права тлумачыць семантыку гэтых казіянальных (сітуатыўных) знакаў як папярэджанне аб неабходнасці прыпыніцца і выканаць дадатковае абрадавае дзеянне, скіраванае на перасцярогу ў дарозе. «Калі дзіця пачынала хадзіць, яму «разразалі путы», г. зн. праводзілі па падлозе нажом або рукой паміж ног і прыгаворвалі: *«Дай, Божачка, у добры час!»*

## Спектр абрадавых кантэкстаў

Пажаданне *«У добры час!»* мела шырокі спектр абрадавых кантэкстаў. У пэўнай ступені яно перагукалася з сімволікай пачатку і часам, прымеркаваным да гэтай пары. Такое пажаданне абавязкова суправаджала пачатак сяўбы, закладванне першага вянка новай хаты, распачынанне жніва, першы выган хатняй жывёлы на пашу і г.д. *«Добры час»* або *«добрая пара»* паступова сталі тым рытуальным эпіцэнтрам, вакол якога сфарміравалася значная колькасць перасцярог, абмежаванняў, рэгламентацый, забаронаў або прадпісанняў. Напрыклад, калі першы раз бачылі маладзік, трэба было сказаць пра сябе замову на шчасце; калі першы раз чулі першы гром, то трэба было перакуліцца цераз галаву або пацерціся аб дуб, каб у час цяжкай летняй працы не балела спіна; калі першы раз чулі зязюлю, то трэба было патрэсці грошы, якія на той момант аказваліся ў кішэні; падчас першага звону на Вялікдзень трэба было загадваць жаданні. Усе гэтыя сітуацыі цесна стасуюцца з маркіроўкай часу як удалага і спрыяльнага.

Некаторыя народныя лекары даюць важнае ўдакладненне да часу захворвання: «Калі захварэеш у добры час, то хутка паправішся, калі ж у благі, то хварэць будзеш доўга». Гэты ж матыў прадстаўлены ў замовах, скіраваных супраць дажджу, навальніцы, граду: *«Сцеражы, Божа, тучу гразавую... / Дай, Божа, у добры час, / У ноч перавядзі спакойную»*.

Калі ў дачыненні да семантыкі і сімволікі паняцця «шчаслівая хвіліна» застаецца шмат непатлумачаных пытанняў, то такая адзінка часу, як «шчаслівы» або «нешчаслівы дзень», акрэслена больш выразна, хаця ў пэўнай ступені і захоўвае шмат рэгіянальных асаблівасцей і рознатлумачанняў. Навуковыя крыніцы апошняга часу прыводзяць шмат фактаў існавання на Беларусі спецыяльных хатніх сшыткаў, у якіх даваўся пералік неспрыяльных дзён. Такі світак-сшытак набываў ролю практычнага дапаможніка, з якім вясковы люд пастаянна суадносіў усе аспекты гаспадарчай і земляробчай дзейнасці. Гэтыя дні называлі «чорнымі» або «нешчаслівымі», а самі «спісы» скручваліся, быццам старажытныя папірусы, і захоўваліся за бажніцай.

*«Правільны – няправільны дзень»*: «дзень вольны ад забаронаў, спрыяльны для выканання тых ці іншых работ», – фіксуе С. М. Талстая. І далей: «Бабы казалі, не снуй у неправільны дэнь, бо прусы да блошчыцы нападуць» [8, с. 187].

Гарызонты асацыятыўнага поля значна пашырацца, а характарыстыка ўскладніцца, калі мы паспрабуем разгледзець дзень у той сістэме каардынат, дзе кожны з іх мае сваю ацэнку адносна гэтай сістэмы. Трэба толькі вызначыць, што будзе пакладзена ў аснову гэтай сістэмы каардынат: фазы Месяца, лічбавы код кожнага дня каляндарнага года, сонечны рух па небасхіле, рэлігійныя вераванні і г.д. Напрыклад, пятніца (аднадзённы пост згодна хрысціянскай традыцыі), якая прыпадае на 13 число месяца і поўню.

Пытанне адносна дакладнага структуравання сутачнага часу ў адпаведнасці з супрацьпастаўленнем *спрыяльны – неспрыяльны час* пакуль што застаецца адкрытым і патрабуе дадатковых мэтанакіраваных пошукаў. Пры гэтым адным з накірункаў пошуку можа быць супрацьпастаўленне топасаў па прынцыпе **святое месца – гіблае месца**, якое цалкам **пераносіцца на дыхатамію абрадавага і пазаабрадавага часу** як сакральнага і прафаннага.

Такім чынам, у міфапаэтычнай спадчыне беларусаў процістанне прасторавых каардынат цалкам паўтарае апазіцыю часавых характарыстык. Абарадавая практыка сведчыць, што нашы продкі лічылі: для таго каб падтрымліваць статус сакральнага часу, неабходна яго штогадовая «падзаводка» шляхам паўтарэння цыкла каляндарных рытуалаў. Гэты ж самы механізм актуалізацыі характэрны і для аказіянальных абрадаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

1. **Беларускі народны каляндар** / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка, – Мінск: Полымя, 1992. – 205 с.
2. **Вяселле:** абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
3. **Домников, С. Д.** Мать-земля и Царь-город. Россия как традиционное общество / С. Д. Домников. – М.: Алетейа, 2002. – 672 с.
4. **Катовіч, А. В.** Летнія святы: у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 1. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 368 с.
5. **Надель-Червинская, М. А.** Энциклопедический мир Владимира Даля / М. А. Надель-Червинская, П. П Червинский. – Книга первая: Птицы. – Т. 2. – Ростов-на-Дону: Феникс, – 1996. – 512 с.
6. **Смоленский этнографичепский сборник**, часть III. – Записки ИРГО по отделению этнографии. Т. XXIII, вып. II. – СПб., 1894.
7. **Толстая, С. М.** Дни добрые и злые / С. М. Толстая // Славянские древности: этнолингв. словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междун. отношения, 1999. – Т. 2. Д–К (Крошки). – С. 94 – 95.
8. **Толстая, С. М.** Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М.: Индрик, 2000. – 600 с.
9. **Щепанская, Т. Б.** Культура дороги в русской мифоритуальной традиции XIX– XX вв. / Т. Б. Щепанская. – М.: Индрик, 2003. – 528 с.
10. **Юдин, А. В.** Русская народная духовная культура: учеб. пособие для студентов вузов / А. В. Юдин. – М.: Высшая школа, 1999. – 331 с.
11. **Элиаде, М.** Священное и мирское / М. Элиаде; пер. с фр., предисл. и коммент. Н. К. Горбовского. – М.: Изд-во МГУ 1994. – 144 с.




# ВІТОЛЬД БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ. ЖЫВАПІСЕЦ ДЗВЮХ ЭПОХ



**А. С. Гібок-Гібкоўскі,**
г. Мінск

**Лёс нашага знакамітага земляка – мастака Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі – і па чалавечых, і па творчых мерках можна лічыць шчаслівым. Яго творчасць і ў дарэвалюцыйнай Расіі, і ў СССР была высока ацэнена грамадскасцю, мастацтвазнаўцамі, дзяржавай. Скажам шчыра, не многім мастакам пры жыцці выпадае такая пашана.**

**Не забыты гэты цудоўны творца і ў нашы дні. У Магілёве дзейнічае першы ў краіне мемарыяльны музей, прысвечаны жыццю і творчасці знакамітага мастака В. К. Бялыніцкага-Бірулі. Яго імем названы вуліцы некаторых беларускіх гарадоў, яго працы шырока прадстаўлены ў Нацыянальным мастацкім музеі.**

## ✍ Вытокі

Нарадзіўся Вітольд Бялыніцкі-Біруля 17 лютага 1872 года ў беларускай вёсачцы Крынкі каля Бялыніч. Дзяцінства прайшло ў невялікай, але вельмі маляўнічай бацькоўскай сядзібе. Вялікі ўплыў на творчае выхаванне хлопчыка аказала маці – выдатны музыкант і ўвогуле ўсебакова адораны чалавек.

Але ў 12 гадоў Вітольда, насуперак меркаванню маці, бацька аддаў вучыцца ў Кіеўскі кадэцкі корпус. У Кіеве хлопец пачынае наведваць урокі жывапісу ў вядомай мастацкай школе М. Мурашкі – аднакурсніка вялікага рускага мастака І. Рэпіна. Там ён знаёміцца і пачынае сябраваць з маладым мастаком Садоўскім. Знаёмства гэтае стала ў жыцці Бялыніцкага-Бірулі лёсавызначальным. Садоўскі здолеў разглядзець велізарны творчы патэнцыял юнага беларуса. Ён раіць Вітольду ехаць на вучобу ў Маскву, прадказаўшы яму феерычны творчы поспех у будучыні. І Бялыніцкі-Біруля прыслухоўваецца да парады старэйшага сябра.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ